Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-08-02

# Што? Дзе? Калі?

Выстаўка «Наперад у мінулае», прысвечаная 70-годдзю беларускай мастацтвазнаўцы Надзеі Высоцкай, праходзіць у зале выяўленчых і відэадакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Доктар мастацтвазнаўства, прафесар БДУ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у сферы навукі і тэхнікі, Надзея Высоцкая доўгі час з'яўлялася загадчыцай аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея. На яе рахунку звыш 500 навуковых каталогаў, манаграфій, брашур, артыкулаў, праграм і метадычных рэкамендацый. Кола навуковых інтарэсаў — выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII — XVIII стст., праблемы ўсеагульнай гісторыі мастацтваў, пытанні рэстаўрацыі і кансервацыі, атрыбуцыі, экспертызы і ацэнкі помнікаў XII — XVIII стст. і інш. Н. Высоцкая была кіраўніком 70 навуковых экспедыцый у Беларусі, пасля чаго амаль 2 тыс. экспанатаў XV — XX стст. знайшлі сваё месца ў фондах дзяржаўных музеяў. Да таго ж, яна плённа займаецца педагагічнай дзейнасцю ў вышэйшых навучальных установах Беларусі, Расіі, Іспаніі, Італіі і Вялікабрытаніі. На выставачных стэндах прадстаўлены навуковыя працы, аўтарэфераты кандыдацкай і доктарскай дысертацый Н. Высоцкай, зборнікі навуковых канферэнцый, артыкулы, паштоўкі, рэпрадукцыі, а таксама выданні, дзе Высоцкая выступала як рэдактар, рэцэнзент і кансультант. Адзін з раздзелаў экспазіцыі пазнаёміць наведвальнікаў з даведвальнымі выданнямі і публікацыямі, якія змяшчаюць матэрыялы пра юбіляра, фотаздымкі з сямейнага архіва.

Выстаўка літоўскага фотамастака Альгімантаса Александравічуса «Розныя эпохі, адзіныя карані» праце ў галерэі «Панарама» НББ. Фотамастак Александравічус паглыбіўся ў мінулае Вялікага Княства Літоўскага і імкнуўся адшукаць у Літве, Беларусі і ва Украіне водбліскі велічы гэтай дзяржавы. Жыццёвыя вехі паэтаў Адама Міцкевіча і Чэслава Мілаша, якія лічылі сябе апошнімі грамадзянамі ВКЛ і прадаўжалі яго традыцыі, знайшлі адлюстраванне ў здымках фотамастака. Альгімантас Александравічус з уласцівай яму вынаходлівасцю злучае знакі, пакінутыя паэтамі на іх жыццёвым шляху, з рэаліямі цяперашніх дзён.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, пры падтрымцы Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі абвясціла правядзенне V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых навукоўцаў і спецыялістаў «Бібліятэка і грамадства: праблемы і кірункі развіцця», якая пройдзе восенню гэтага года. Плануецца абмеркаваць гісторыю бібліятэчнай справы, праблемы фарміравання, захаванасці і выкарыстання фондаў рэдкіх кніг і рукапісаў, інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк, менеджмент і маркетынг, бібліятэчную адукацыю ў кантэксце грамадскага развіцця, укараненне і выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, а таксама іншыя пытанні.

Адбылося першае пасяджэнне Савета Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі ў новым складзе. Па яго выніках прынята рашэнне завяршыць фарміраванне складаў камітэтаў да 1 верасня 2013 года. Старшыням камітэтаў рэкамендавана больш актыўна прыцягваць да працы спецыялістаў з рэгіянальных бібліятэк. Члены Савета таксама абмеркавалі пытанні арганізацыі і правядзення Дня бібліятэк. Было вырашана, што галоўныя мерапрыемствы пройдуць 12 верасня на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Адбудзецца ўрачысты мітынг ля помніка Францыску Скарыне, прэс-канферэнцыя, прысвечэнне ў прафесію маладых спецыялістаў сталічных бібліятэк, адкрыецца выстаўка творчых работ бібліятэкараў рэспублікі. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы акцыі возьме Міжведамасны гарадскі бібліятэчны савет.

**Даніла АРЦІМОВІЧ**

Даніла Арцімовіч. Што? Дзе? Калі?